Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-07-12

**Гісторыка-краязнаўчы музей "Пад стрэхамі продкаў" сярэдняй школы № 209 Мінска быў адкрыты ў 2000 годзе. Сёння асноўны фонд музея налічвае 800 экспанатаў. Рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 20.06.2011 года музею было прысвоена званне "Народны".**

# Пад стрэхамі продкаў

Краязнаўчы музей у нашай школе — гэта месца, дзе адлюстроўваецца частка нашага школьнага жыцця, яго традыцыі і гісторыя. Музей па праву стаў культурна-асветніцкім цэнтрам школы: тут праводзяцца экскурсіі, выставы, урачыстыя мерапрыемствы, сюды прыходзяць ветэраны вайны і працы, бацькі, вучні і настаўнікі школ раёна, госці з іншых краін. Напрыклад, госці з Японіі ў кнізе водгукаў напісалі: "Мы здзіўлены, з якой любоўю вашы дзеці захоўваюць гісторыю сваёй краіны".

Можна з упэўненасцю сказаць, што наш музей — гэта памяць народа, на аснове якой фарміруецца культурная асоба. Таму патрыятызм і ідэалагічнае выхаванне трэба пачынаць з аповеду аб тым, што Беларусь — гэта дзяржава з вялікай гістарычнай і культурнай спадчынай. У музеі прадстаўлены асноўныя перыяды гісторыі нашай краіны, пачынаючы з каменнага веку, славянскіх старажытнасцей, этнаграфічнага матэрыялу.

Гэта мае для вучняў вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне, таму неабходны гістарычны матэрыял для музея яны атрымліваюць падчас экспедыцый і паходаў па роднай краіне, архіўных пошукаў, вырабу макетаў, завочных падарожжаў. Школьнікі падарожнічалі па памятных мясцінах Беларусі: у Хатынь, на Курган Славы, на Лінію Сталіна, у Брэсцкую крэпасць. Краязнаўчы музей стаў і ідэалагічным цэнтрам школы: ва ўрачыстай атмасферы дырэктар школы Віктар Віктаравіч Пуршнёў уручае білеты новым членам грамадскай арганізацыі "Белая Русь", пад гукі гімна вучняў прымаюць у БРПА, БРСМ, праходзяць сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.





Вынікам адукацыйных і выхаваўчых задач музея стала пашырэнне форм яго дзейнасці: ад спецыфічна музейных да нетрадыцыйных. Гэта з'яўленне новых тэматычных экскурсій-лекцый: "Сем цудаў музея", "Гісторыя аднаго фотаздымка", "Гісторыя аднаго экспаната", віртуальныя экскурсіі. Вучні-экскурсаводы намагаюцца ствараць такую эмацыянальную атмасферу, каб наведвальнікі музея не толькі атрымалі веды па прапанаванай тэме, але і адчулі так званае выхаванне гісторыяй.

Матэрыялы музея актыўна выкарыстоўваюцца школьнікамі для ўдзелу ў такіх патрыятычных акцыях, як "Па слядах аперацыі "Баграціён", "Успомнім іх пайменна" і інш. Работы юных краязнаўцаў былі прадстаўлены на раённых, гарадскіх і рэспубліканскіх конкурсах і адзначаны дыпломамі і граматамі. У рамках работы над праектам "Юныя міратворцы" члены Савета музея супольна з грамадскімі арганізацыямі школы даглядаюць помнікі ў гонар воінаў, якія загінулі ў мірны час і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Наш краязнаўчы музей — жывы арганізм. Яго фонды папаўняюцца новымі матэрыяламі, з'яўляюцца новыя экспазіцыі. Толькі за апошні 2011/2012 навучальны год з'явіліся экспазіцыі "Так адыходзіла сталінская эпоха", "Касмічная эпапея Савецкага Саюза", "Прадметы побыту савецкіх людзей", "Старонкі школьнай гісторыі". Сёння вучні вядуць збор матэрыялаў аб героях Савецкага Саюза, ураджэнцах Беларусі, якія вызвалялі нашу краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Работы членаў Савета музея неаднаразова публікаваліся на старонках газет "Переходный возраст", "Зорька", "Юный спасатель", у часопісе "Планета-семья". За актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах работ на ваенна-патрыятычную тэму Савет музея быў узнагароджаны дыпломамі Беларускага таварыства памяці воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Якаў БАСКІН,**
**кіраўнік музея, выдатнік народнай адукацыі.**